# БЕЛАРУСЬ ЦВЁРДА ЗАМАЦАВАЛАСЯ Ў ДВАЦЦАТЦЫ МАЦНЕЙШЫХ СПАРТЫЎНЫХ КРАІН У СУСВЕТНЫМ РЭЙТЫНГУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апазіцыя ж, паводле яго слоў, на мінулых выбарах «прапанавала альтэрнатыву ў выглядзе чыстага папулізму, і, вядома, народ гэтаму не паверыў». Больш за тое, быў узяты шлях на рэвалюцыйныя перавароты. «Такой падтрымкі яны не атрымаюць, і гэтым самым яны сябе вельмі апусцілі», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў, што цяпер апазіцыі атрымаць народную падтрымку будзе вельмі складана, бо ў людзей у памяці ўжо выразна забіта: калі гэта апазіцыя — значыць гэта вайна». «Ну, гэта яны стварылі — гэта не я ім ствараў», — заўважыў беларускі лідар.

Успамінаючы пра падзеі 19 снежня, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што катэгарычна забараніў трымаць на вуліцы хоць аднаго лішняга міліцыянера. Аднак, калі пачаўся штурм Дома ўрада, гэта было неабходна спыніць, і праваахоўныя органы дакладнымі дзеяннямі за сем з паловай хвілін навялі належны парадак.

Разам з тым Прэзідэнт адзначыў, што не збіраецца перашкаджаць развіццю ў Беларусі канструктыўнай апазіцыі, таксама як не мае намеру і спецыяльна ствараць яе самому сабе. «Я хачу, каб у нашай краіне людзі не толькі на кухнях шапталіся і нешта абмяркоўвалі, я хачу, каб людзі, як сапраўдныя беларусы, прыстойныя, абмяркоўвалі праблемы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Хоча апазіцыя (канструктыўная) з'явіцца — няхай з'яўляецца. Такая апазіцыя (як цяпер) — будуць атрымліваць па поўнай, калі яны будуць дэстабілізаваць абстаноўку ў краіне». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Мы з імі так сябе паводзіць не будзем, як да гэтага».

«Яны нас заспакойвалі, Захад нас заспакойваў, прыехалі тут вялікія дзеячы правільнай і няправільнай арыентацыі і мяне пачалі папракаць у тым, што я, бачыце, асудзіў мужчын нетрадыцыйнай арыентацыі і г.д., — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Ну не падабаюцца мне такія людзі, я і сказаў, што не падабаюцца. Бачыце, асобныя міністры замежных спраў пакрыўдзіліся на мяне. Чаго на мяне крыўдзіцца? Мы ў дэмакратычным грамадстве жывём, тым больш я Прэзідэнт і маю права выказаць свой пункт гледжання і сваю пазіцыю. Я яму прама і сказаў гэта ў вочы. І за гэта, бачыце, яны крыўдзяцца. Нармальны лад жыцця трэба весці. А ненармальны мы не прымаем, і нам не трэба яго навязваць. У Германіі гэта магчыма, у Польшчы — калі ласка, няхай яны гэтым і займаюцца там, а нам сюды гэтага не трэба. Хоць гэтага дабра хапае, на жаль».

«Мяне выбраў народ, і я буду праводзіць тую палітыку, якая нам выгадна. Не трэба нас пужаць, што Лукашэнка сябе загнаў зноў у нейкае расійскае балота і гэтак далей, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Расіяне павінны разумець, што яны — нашы браты, мы заўсёды будзем адданыя і верныя дружбе з расіянамі. Калі нехта там наверсе спрабуе выкарыстаць сітуацыю і нас нахіліць — нічога не атрымаецца». У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы згадаў сітуацыю з двума грамадзянамі Расіі, арыштаванымі за ўдзел у масавых беспарадках у ноч пасля прэзідэнцкіх выбараў. «Вас хто сюды клікаў граміць Дом урада?» — задаў рытарычнае пытанне беларускі лідар.

Што датычыцца рэакцыі расійскага боку на арышт гэтых двух чалавек, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Мы ж Расію не папракалі, калі яны расстрэльвалі парламент і Дом урада — па Беламу дому палілі з танкаў. Мы не ўмешваліся ў іх справы. На Манежнай плошчы здарылася — мы спачувалі людзям. Чаго ж вы там, каб дагадзіць не то Захаду, не то ўнутраным сілам, пачынаеце падыгрываць і нам тут праблемы ствараць?» Прэзідэнт адзначыў, што і ў Расіі праблем дастаткова, таксама як і на Захадзе. «Мы ні пад кога прагінацца не будзем, нават калі давядзецца пайсці ў зямлянкі. Мы туды пойдзем, як гэта было ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, але перад вамі не будзем прагінацца. Калі ў немцаў і палякаў памяць кароткая, і яны забылі, колькі мы палажылі на алтар гэтай перамогі, а тым больш некаторыя расіяне забылі, што мы разам гнілі ў акопах, ну, Гасподзь ім у дарогу, нам з імі не па дарозе, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Таму трэба супакоіцца, мы ні пад кога не будзем прагінацца, мы ні да кога не нахіляемся. Хочуць з намі супрацоўнічаць як са свабоднай незалежнай суверэннай краінай — калі ласка, будзем супрацоўнічаць і будзем працаваць на агульную карысць. Не хочуць — гэта іх праблемы».

Журналісты таксама цікавіліся меркаваннем беларускага Прэзідэнта аб хваляваннях у шэрагу дзяржаў Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі. Кіраўнік дзяржавы заявіў аб неабходнасці атрымаць урокі з падзей у Егіпце і Тунісе.

«Мы яшчэ будзем усё гэта назіраць: ад гэтай тунісізацыі, каірызацыі і іншай рэвізацыі свет яшчэ ўздрыгне і не адзін раз», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Вы добра бачыце, хто прыходзіць там да ўлады, хто бярэ ўладу ў рукі ў гэтых краінах. Гэта першае. Другое — адзін з урокаў — вось іх сумленнасць і прыстойнасць. Хосні Мубарак быў жа бліжэйшым сябрам амерыканцаў пасля караля Саудаўскай Аравіі, а, можа, нават лепшым для амерыканцаў. Амерыканцы ж заўсёды апіраліся на гэту ключавую дзяржаву, дзе галоўную ролю адыгрываў Хосні Мубарак. Яго крытыкавалі ўсе, увесь арабскі свет за тое, што ён залішне лажыцца пад Захад».

Кіраўнік дзяржавы прадоўжыў: «Туніс — гэта быў наогул узор, маяк для развіцця Афрыкі. Яго і іншых ствараў і падтрымліваў Еўрапейскі саюз. І што адбылося, калі там пачаліся хваляванні? Яны кінулі гэтых прэзідэнтаў і пачалі патрабаваць дэмакратыі».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, «калі б увесь свет, асабліва амерыканцы і еўрапейцы, выступілі супраць вось гэтай залішняй ісламізацыі арабскага Усходу, супраць радыкалізацыі, напэўна, можна было б гэты пажар пагасіць». «Але яны гэтага не зрабілі. Яны зноў бачылі свае мэты, — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Але яны тут перайгралі самі сябе. Гэта так, па гарачых слядах. Я не хачу ўдавацца пакуль у глыбіню. Час рассудзіць і пакажа».

«Але тое, што ўспыхнуў увесь арабскі Усход, — свету, і асабліва Еўропе і Амерыцы, ад гэтага горача будзе. Але гэта іх твар. Вось так яны сябе паводзяць. Так яны кідаюць сёння сваіх «сяброў», на якіх яны некалі апіраліся», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«І гэта лішні раз пацвярджае, гэта ўрок для нас: нікому нельга верыць, ні на кога нельга спадзявацца, толькі на свае сілы», — дадаў Прэзідэнт.

На яго думку, «нікому не патрэбна моцная краіна — моцных баяцца, іх страшна не любяць». «Моцныя не патрэбны. Таму і нас дзяўбуць і будуць дзяўбці», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Але для нас гэта ўрок: мы самі павінны рабіць тое, на што здольны, і бачыць толькі сваю краіну, свой народ, не ўмешваючыся ў іх разборкі».

Пры гэтым Прэзідэнт рэзюмаваў, што яшчэ вельмі рана рабіць высновы па рэвалюцыях гэтага «перыметра арабскага Усходу».

Журналістаў таксама цікавіла тэма прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў і, у прыватнасці, паведамленні аб прапанове расійскай дзяржкарпарацыі «Растэхналогіі» па набыцці беларускага МАЗа.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «ніколі не разглядаў прыватызацыю МАЗа ў чыстым выглядзе». Паводле слоў Прэзідэнта, у адказ на зварот расійскіх кампаній ён прапаноўваў аб'ядноцца, не чапаючы ўласнасць, гэта значыць, нічога не прыватызуючы, і выпрацаваць на працягу некалькіх гадоў прынцыпы, на якіх будзе будавацца далейшая работа. І толькі потым прапаноўвалася вырашыць пытанне аб абмене акцыямі, іх куплі або продажы. «За бясцэнак мы нічога нікому аддаваць не будзем. Заплацяць нам добрыя грошы, якіх каштуе прадпрыемства, мы будзем думаць. Пакуль такіх прапаноў не было. Такім чынам, гэта чыстай вады інсінуацыі і ўкіды. Мы нават не падступаліся да гэтых пытанняў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што сёння МАЗ практычна ні ў чым не ўступае КамАЗу, нават пераўзыходзіць свайго расійскага канкурэнта. Так, у мінулым годзе КамАЗ прадаў усяго на 3 тыс. аўтамабіляў больш, чым МАЗ, нягледзячы на тое, што расійская кампанія значна большая. Акрамя таго, гэта стала магчымым ва ўмовах тых перашкод, якія ставіліся для беларускай прадукцыі на традыцыйным расійскім рынку.

Наконт магчымай прыватызацыі МАЗа беларускі лідар таксама адзначыў, што расійскі бок не адзіны, хто выступаў з такімі прапановамі. Адпаведнае жаданне выказвала і Венесуэла, прапануючы добрыя грошы за частку акцый гэтага прадпрыемства. «Так што ў нас ёсць і іншыя прапановы, больш выгадныя, дзе ў нас не патрабуюць кантрольных пакетаў і іншае», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што вяліся перагаворы і з Кітаем аб магчымасці прыватызацыі БелАЗа. «Нават кітайцам адмовілі ў прыватызацыі БелАЗа і прапанавалі стварыць зборачную вытворчасць у выглядзе сумеснага прадпрыемства, што мы і зрабілі», — адзначыў ён.

«Таму гэта звычайныя ўкіды, «вутка» і інсінуацыя. Ніхто без Прэзідэнта нават абмяркоўваць не стане прыватызацыю такіх гігантаў, брэндаў беларускай эканомікі, як БелАЗ, МАЗ, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы будзем іх развіваць, і я як Прэзідэнт буду рабіць усё, каб не страціць гэтыя прадпрыемствы ні ў якім выпадку. Ніякай дзікай прыватызацыі: прыходзьце, плаціце грошы, кантрольны пакет павінен у нас быць, мы павінны кіраваць гэтымі прадпрыемствамі. Хочаце з намі працаваць, зарабляць прыбытак — калі ласка, прыходзьце, будзем працаваць. Такая пазіцыя сёння. Будуць добрыя прапановы, у выніку чаго можа змяніцца пазіцыя, я нічога скрываць не буду, я людзям аб гэтым скажу».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў Беларусі ўжо даўно аб'яўлены прынцыпы, на якіх магчыма прыватызацыя дзяржуласнасці, і «ніхто штучна нічога не будзе стрымліваць».

Каменціруючы домыслы аб тым, што нібыта пасля выбараў пачнецца наменклатурная прыватызацыя, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Вось тады я дакладна не буду Прэзідэнтам, калі нехта з наменклатуры пачне штосьці дзяліць. Не будзе гэтага ніколі ў Беларусі! Ні Лукашэнка, ні яго дзеці — ніхто не атрымае ні аднаго кавалка ад дзяржуласнасці за так».

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Государственное имущество и право заключения договора аренды земельного участка** |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Брестская область, Столинский район, 1,2 км севернее железнодорожной станции «Припять» |
| **Продавец недвижимого имущества** | РТУП «Белорусское речное пароходство», тел. 8 (02351) 2 29 58 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Государственное имущество: артскважина с кирпичной насосной 1986 г.п, общая площадь 9,0 кв.м; трансформаторная подстанция 1986 г.п., общая площадь 36,6 кв.м, 1 эт., кирпич; очистные сооружения, площадь 46,0 кв.м; водонапорная башня 1986 г.п, объем 171 куб.м из железобетонных панелей, общая площадь 9,0 кв.м.; изолированное помещение (административно-бытовое помещение) 3-эт. кирпич., общая площадь 506,3 кв.м; изолированное помещение (котельная) 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 49,7 кв.м; изолированное помещение (ремонтные мастерские) 1986 г.п, кирпичное, общая площадь 261,2 кв.м.<br>Земельный участок площадью 0,5498 га, имеются ограничения в использовании земель в водоохранной зоне р. Припять и в прибрежной полосе р. Припять на площади 0,5498 га, земельный участок в установленном порядке использовать для обслуживания государственного имущества; срок аренды – 50 лет. |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 224 964 335 |
| **Сумма задатка, руб.** | 22 496 430 |
| **Организатор аукциона** | ***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел.: (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by*** |

Аукцион состоится **25 марта 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

**Для участия в аукционе представляются***:*

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения задатка – по **24 марта 2011 г. включительно.**

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенным Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462, Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. № 36.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 24 марта 2011 г. включительно.***

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *4 марта 2011 г.* повторно проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 77 | Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 83 | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Новое Поле |
| 2 | Кадастровый номер | 623680602601000846 | 623680602601000864 | 623681315101000215 | 623681315101000216 | 623681315101000217 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1489 га | 0,1497 га | 0,1521 га | 0,1521 га | 0,1521 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 320 260 | 1 435 360 | 1 178 283 | 1 178 283 | 1 178 283 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 95 000 000 | 96 000 000 | 11 000 000 | 11 000 000 | 11 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 9 500 000 | 9 500 000 | 1 100 000 | 1 100 000 | 1 100 000 |

| | | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Новое Поле | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 217 | Папернянский с/с, д. Семково, участок № 218 |
| 2 | Кадастровый номер | 623681315101000218 | 623681315101000219 | 623685510601001361 | 623685510601001361 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1521 га | 0,1522 га | 0,1467 на | 0,1373 на |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 178 283 | 1 178 283 | 859 960 | 859 960 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 11 000 000 | 11 000 000 | 29 000 000 | 27 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 1 100 000 | 1 100 000 | 2 900 000 | 2 700 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 04.03.2011 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 28.02.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, 13/2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 3–7 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 8–9 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *25 марта 2011 года* проводит открытый *аукцион* на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Горанский с/с, д. Капличи | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи |
| 2 | Кадастровый номер | 623681308601000036 | 623681708601002213 | 623683403101007020 | 623683903601000064 | 623655500001000303 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,7198 га | 0,8501 га | 0,1502 га | 0,0386 га | 0,5004 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 50 | 40 | 50 | 51 | 51 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства торгового центра с офисными помещениями | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства универсального магазина | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | – | – | – | 630 300 | 8 487 405 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 2 139 391 | 2 151 045 | 1 597 744 | 2 156 134 | 1 827 820 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 11 784 доллара США | 33 676,20 доллара США | 18 378 долларов США | 516 долларов США | 35 851,36 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 3 000 000 | 10 000 000 | 5 000 000 | 150 000 | 10 000 000 |

| | | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 | Лот 9 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Новодворский с/с, а/г Новый Двор | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Урожайная | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Щитомиричи | Минский район, Сеницкий с/с, район д. Урожайная |
| 2 | Кадастровый номер | 623684305601000403 | 623686600001000219 | 623686600001000221 | 623686600001000220 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0499 га | 0,3994 га | 1,3473 | 1,6808 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 50 | 71 | 51 | 71 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства магазина | Для строительства оздоровительного центра с административным зданием | Для строительства производственно-складских помещений | Для строительства гостиницы на 100 мест с рестораном на 150 мест |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х производства (рублей) | – | – | 62 722 800 | – |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 660 200 | 1 050 643 | 1 597 022 | 833 751 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 2 329 долларов США | 102 141 296 белорусских рублей | 110 525 долларов США | 429 842 445 белорусских рублей |
| 9 | Задаток (рублей) | 600 000 | 10 000 000 | 30 000 000 | 40 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 25.03.2011 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов – 21.03.2011 г. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3641000233719, отделение № 537, г. Минск, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона. Договор аренды земельного участка заключается с победителем в течение 2-х рабочих дней после внесения им всех причитающихся платежей.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками; ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

## Уважаемые акционеры ОАО «Ресторан «Беларус»!

**24.03.2011 года**
**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Ресторан «Беларус», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 г. и основных направлениях развития Общества на 2011 г.
2. О работе Наблюдательного совета в 2010 г.
3. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества и работе ревизионной комиссии в 2010 г .
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса за 2010 г.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2010 г. О выплате дивидендов за 2010 г.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2011 г. и в 1 квартале 2012 года.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об утверждении изменений и дополнений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15 А, с 16 марта по 23 марта 2011 года (время работы с 9.00 до 17.00) либо 24 марта 2011 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 24 марта 2011 года, 15.00.

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 24 февраля 2011 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100055804.

**28 марта 2011 г. в 16.00**
**СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ЗАО «ПРИПУТНИК»

**по адресу: г. Минск, пр. Рокоссовского, д. 1.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
2. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности, годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
3. Избрание членов наблюдательного совета.
4. Избрание членов ревизионной комиссии.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая.

С материалами, подготовленными к собранию, можно будет ознакомиться с 21 марта 2011 г. с 15.30 по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания будет осуществляться с 15.45 до 16.00 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе нужно иметь следующие документы:

- акционеру общества – паспорт,
- представителю акционера – паспорт, доверенность.

УНН 100071629.

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!**

## ОАО «ОБУВЬТОРГ»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 24 марта 2011 года ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 28.**

**Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по предъявлению документов.**

**Начало собрания в 14.00.**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год и перспективах развития на 2011 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2010 году.
3. О результатах проверки Общества ревизионной комиссией за 2010 год.
4. Об утверждении годового баланса, направлений использования чистой прибыли, отчета по прибылям и убыткам за 2010 год.
5. Об утверждении дивидендов за 2010 год.
6. Об утверждении направлений использования чистой прибыли на 2011 год.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
8. Об утверждении условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, предлагаемыми для ознакомления акционерам по вопросам повестки дня собрания, можно ознакомиться: в рабочие дни — понедельник—пятница, начиная с 17 марта 2011 года по месту нахождения Общества.

УНН 100262652

**Наблюдательный совет.**

«НЯХАЙ МЫ БУДЗЕМ РАЗВІВАЦЬ НЕЙМАВЕРНЫЯ НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, АЛЕ ПАКУЛЬ МЫ БУДЗЕМ ПРОСТА ВЕТЛІВЫЯ З КЛІЕНТАМ — ЁН БУДЗЕ НАШ.»

«МЫ І НАДАЛЕЙ ПЛАНУЕМ БЫЦЬ АКТЫЎНЫМІ ГУЛЬЦАМІ НА РЫНКУ ЗНАКАВЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРАГРАМ.»

Мікалай НОВІКАЎ, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па інвестыцыях і сацыяльным развіцці:

# «ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ПАШТОВУЮ ГАЛІНУ — ГЭТА ЎКЛАДАННІ Ў НАШУ БУДУЧЫНЮ»



**Рух наперад — гэта аксіёма паспяховасці ў любой справе. У дачыненні да паштовай галіны — яшчэ і набыццё новых кантактаў і стасункаў паміж рознымі пластамі насельніцтва, арганізацыямі, прадпрыемствамі. Ад таго, наколькі апаратыўна і хутка яны могуць адбыцца, залежыць шмат. Таму важнасць дынамічнага развіцця паслуг паштовай сувязі на прасторах нашай краіны, якая мае вельмі цесныя стасункі з калегамі іншых краін, пераацаніць немагчыма.**
**Пра тое, у якім кірунку развіваецца сёння айчынная пошта, наша размова з намеснікам генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па інвестыцыях і сацыяльным развіцці Мікалаем НОВІКАВЫМ.**

**— Мікалай Георгіевіч, як бы не развіваліся цывілізаваныя адносіны паміж людзьмі ў бок удасканалення, у многіх усё роўна работа паштавікоў будзе асацыявацца з паштовым голубам, які на хвасце прынясе ці даставіць пісьмо да патрэбнага адрасата.**

— Ведаеце, не мной жа прыдумана, што ўсё геніяльнае — проста. Таму, на мой погляд, будзе гэта паштовы голуб ці музычны інструмент у выглядзе трубы, які, дарэчы, прысутнічае на лагатыпе паштовых арганізацый многіх краін свету, сутнасць справы не мяняецца — гэта проста сімвал. А вось магчымасці паштовай сувязі і якасць іх паслуг чалавек павінен ацаніць, калі вырашыў аформіць падпіску на якое-небудзь выданне, адправіць тэлеграму альбо ліст, заказаць праз пошту нейкую каштоўную рэч.

> ***А вось магчымасці паштовай сувязі і якасць іх паслуг чалавек павінен ацаніць, калі вырашыў аформіць падпіску на якое-небудзь выданне, адправіць тэлеграму альбо ліст, заказаць праз пошту нейкую каштоўную рэч.***

**— У дачыненні да РУП «Белпошта» можна сказаць, што ўсе паслугі аказваюцца на вышэйшым узроўні?**

— Не скажу, што ў нас няма праблем, бо, як вядома, удасканаленню няма межаў, тым не менш мы стараемся трымаць увесь час руку на пульсе і не адставаць ад патрэб насельніцтва. І наш дэвіз: «Хуткасць, недзейнасць, даступнасць!» мы стараемся апраўдваць.

**— Можаце прывесці канкрэтныя прыклады?**

— Напачатку хочацца адзначыць, што РУП «Белпошта», для таго, каб крочыць у нагу з часам, у сваёй дзейнасці актыўна ўдзельнічае ў розных дзяржаўных і галіновых праграмах, скіраваных на развіццё традыцыйных і новых паслуг паштовай сувязі. Так, у рамках Праграмы развіцця сувязі ў Рэспубліцы Беларусь, якая нядаўна завяршылася, намі была праведзена мадэрнізацыя і рэканструкцыя больш як 350 аб'ектаў паштовай сувязі. Скажу болей, наша прадпрыемства прымала актыўны ўдзел у Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця сяла, якая была разлічана да 2010 года. За час рэалізацыі гэтага дзяржаўнага праекта намі праведзены рамонтна-будаўнічыя работы амаль на 1,5 тысячы аб'ектаў паштовай сувязі, арганізаваны новыя працоўныя месцы і пункты доступу ў інтэрнэт. Самы актыўны ўдзел прынялі ў рэалізацыі Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх паселішчаў. Безумоўна, у актыў РУП «Белпошта» можна аднесці і яе плённую работу яшчэ ў адной Дзяржаўнай праграме — аб беспераашкодным асяроддзі жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб.

**— Паштавікі для папулярызацыі сваіх паслуг традыцыйна робяць упор і на мерапрыемствы дзяржаўнай важнасці, якія не з'яўляюцца профільнымі.**

— Так, наша прадпрыемства актыўна прымае ўдзел у правядзенні рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі», Дня беларускага пісьменства. Такія святы — гэта яшчэ адна нагода, каб прывесці аб'екты паштовай сувязі да больш дасканалага тэхнічнага і эстэтычнага стану, арганізаваць гандлёвыя месцы па рэалізацыі маркіраванай і немаркіраванай прадукцыі, друкаваных сродкаў масавай інфармацыі.

З іншых значных акцый, дзе не апошнюю ролю адыграла РУП «Белпошта», можна адзначыць Год роднай зямлі, дзякуючы якому прыведзена ў належны парадак 79 памяшканняў і 7108 квадратных метраў тэрыторый, што прылягаюць да іх.

**— Мікалай Георгіевіч, уласным інвестыцыям у развіццё і сацыяльнаму развіццю на прадпрыемстве быць у далейшым?**

— А без гэтага немагчыма нармальна развівацца і разлічваць на прафесіяналізм работнікаў, якія працуюць у той ці іншай галіне. Інвестыцыі ў паштовую галіну і сацыяльнае развіццё — гэта ўкладанні ў нашу будучыню. Мы і надалей плануем быць актыўнымі гульцамі на рынку знакавых Дзяржаўных праграм. Да тых, якія ўжо пералічаны, мне хацелася б дадаць Дзяржаўную праграму па будаўніцтве буйных жылых раёнаў для жыхароў г. Мінска ў гарадах-спадарожніках і вынасе альбо пераносе са сталіцы ў населеныя пункты рэспублікі вытворчых аб'ектаў, а таксама ў частцы праектавання і будаўніцтва аб'ектаў сацыяльна гарантаванага абслугоўвання насельніцтва, уключаючы аддзяленні паштовай сувязі.

## ЛЮБЯЧЫ, НЕ АДМАЎЛЯЮЦЦА

«Звязда»: плюсы і мінусы

**«Звязду» пачала выпісваць гадоў 20-25 таму — дзеля мовы. У школе, потым у тэхнікуме, на працы — паўсюль гучала руская. Роднай, загнанай у кут, мне было вельмі шкада, хацелася хоць неяк абараніць яе, хоць неяк падтрымаць... Тады я нават не думала, як яна... падтрымае мяне.**

Стала я выпісваць газету, стала чытаць, вядома ж, усіх і ўсё, потым з'явіліся журналісты-любімчыкі. Ціха, здалёк сачыла за публікацыямі Алены Ляўковіч, Сяргея Шаўцова, Валянціны Доўнар... Некага хацелася пахваліць, з некім паспрачацца, але ж каб тэлефанаваць у рэдакцыю, каб пісаць... Не.

Я маўчала, аж пакуль не ўрадзілі ў мяне кавуны. Адзін — нечакана нават для самой — аж 15 кілаграмаў быў! На старонках «Звязды» людзі такімі гарбузамі хваліліся, а тут жа кавун. Ганарлівасць у нашай вёсцы ўласціва ўсім — ад старога да малога. Напісала.

На тую, самую першую публікацыю было шмат водгукаў, у тым ліку — кніга з аўтографам (!) вядомага траўніка з Брэстчыны Канстанціна Іванавіча Місюты. Гэта ж гонар для мяне. І апроч таго — стымул, каб яшчэ нешта вырасціць і напісаць у газету, бо канкурэнцыі я ніколі не баялася, наадварот: калі ў мяне штосьці ўрадзіла, атрымалася, то хай жа ва ўсіх радасць будзе.

На наступны год захапілася я баклажанамі. Зноў удаліся! Ну як было не расказаць пра сакрэты, як не падахвоціць чытачоў?!

Але ж па-сапраўднаму я знайшла сябе не на зямлі, не ў «Крынічцы», а куды вышэй — «...На провадзе!»: начытаўшыся чужых вясёлых і праўдзівых гісторый, узяла ды напісала сваю, пра тое, як хадзіла па Рагачову ў толькі што забраным з атэлье пінжаку з квітанцыяй на спіне. Дарэчы, цяпер я напісала б яе куды цікавей.

Хоць гонару было і тады.

За першай гісторыяй было чаканне наступных, былі, дзякуючы газеце, новыя завочныя і «вочныя» знаёмствы з іншымі падпісчыкамі. Найперш — з пісьменніцай Лідзіяй Львоўнай Арабей, з агародніцай і кветачніцай Дзінай Паўлаўнай Вараб'ёвай з Гомеля, з Нінай Мацвееўнай Бурко з Бярэзіншчыны (хоць трохі ведаючы яе, верыш, што камунізм — магчымы), з маёй землячкай, чалавекам рэдкай прыгажосці і мужнасці — Антанінай Мікалаеўнай Ерамеевай...

Іншымі словамі, супрацоўніцтва са «Звяздой» узняло мой аўтарытэт: вяскоўцы, калі што, пайшлі па параду — «Кусянкова ведае...», «Кусянкова скажа...» (дарэчы, сказала, што трэба выпісваць «Звязду, то выпісваюць і сельскі Савет, і бібліятэка). А летась і наогул... Камбайн у вёсцы малаціў збажыну і адзін падворак аб'ехаў. То гаспадар прыгразіў, што зараз пойдзе і ўсё раскажа Кусянковай, а яна — у газету напіша... Спрацавала!

І працуе: мае байкі з «Провада...» — на бачным месцы ў нашай бібліятэцы: хай кожны пачытае, хай ведае...

Што ад гэтага мне? Змянілася, так бы мовіць, якасць майго жыцця: мне прыходзяць лісты, у мяне не маўчыць тэлефон, я стала паважаць сябе, яшчэ больш ганарыцца сваёй роднай вёскай, якой, дарэчы, больш за 870 гадоў, сваімі землякамі. Дзякуючы «...Народу на провадзе» і «Слоўніцы», уся краіна цяпер ведае нашы звычкі, нашы слоўцы, нашу барацьбу за гміну (за сельскі Савет, які перанеслі-такі ў іншую вёску). Дарэчы, людзі потым казалі, што калі б пад першым зваротам у рэдакцыю быў не адзін мой подпіс, а сотні, усё магло б атрымацца іначай...

Зрэшты, агітаваць за «Звязду» яе чытачоў і падпісчыкаў, мусіць, не варта, бо нешта падобнае пра газету могуць расказаць многія. А вось іншым...

Вельмі хочацца, каб людзі паверылі, што толькі з гэтай газетай можна адкрыць у сабе новыя таленты (я, як высветлілася, нават вершы пішу), самасцвердзіцца, зрабіцца запатрабаваным, пазнаёміцца з новымі людзьмі, адкрыць у сабе і іншых тое, чаго ніколі не чакаў.

Мне падабаецца пазіцыя газеты па многіх пытаннях, але ж галоўная — насуперак усяму заставацца адданай мове, якая ў нас у генах, якая, як бы мы ні выракаліся, прабіваецца наверх то нейкім словам, то акцэнтам. Па іх і пазнаюць беларусаў. А так хочацца, каб прызнавалі — за нацыю са сваёй мовай.

Да слова: знаёмая, таксама падпісчыца «Звязды», нядаўна паскардзілася, што ў газеце бывае шмат рэкламы, шмат табліц, што калі ў ёй да таго ж не будзе пэўных імён журналістаў, яна ад падпіскі адмовіцца...

А я сказала, што не. Хіба газета — свят-свят-свят — адмовіцца ад роднай мовы.

**P.S.** ***Не сказала пра мінусы. Чаму — відаць, зразумела: за тым, каго шчыра любіш, каму да скону ўдзячны, іх проста не заўважаеш.***

## СВЕТ У ПАШТОЎЦЫ

Стомлена цягнуся дадому, настрой дурны, і здаецца, нішто і ніхто яго не выратуе. Па звычцы адкрываю паштовую скрыню і бачу сярод газет і рэкламных улётак ... паштоўку! На ёй жоўты смайлік і надпіс «Усміхайцеся часцей». Міжвольна я так і раблю, і маёй радасці няма мяжы. Дзякуй за гэта пасткросінгу — праекту, які дорыць людзям столькі станоўчых эмоцый.



Калаж І. ГАРДЗІЕНКА.

3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков и годовому отчету Общества.
*Докладчик: председатель ревизионной комиссии — Артамонова Е.В.*
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2010 год.
*Докладчик: главный бухгалтер — Кутепов И.В.*
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2010 год.
*Докладчик: зам. генерального директора по экономическим вопросам — Артамонова О.В.*
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2011 год.
*Докладчик: зам. генерального директора по экономическим вопросам — Артамонова О.В.*
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
*Докладчик: начальник ООТиЗ — Михновец Л.В.*
9. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».
*Докладчик: зам. генерального директора по экономическим вопросам — Артамонова О.В.*
10. О внесении изменений в Устав Общества.
*Докладчик: начальник юридического отдела — Дударевич Н.Н.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел.: 223 17 02, 3 15.

Начало работы собрания — 10.00.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2011 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

**31.03.2011 г. в 12.00 в здании Путришковского сельского исполнительного комитета (аг. Путришки, ул. Тарханова, 49) состоится аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного, блокированного жилого дома.**

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, белор. руб. | Размер задатка, белор. руб. | Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, белор. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | 422088009601000426 Гродненская область, Гродненский район, аг. Путришки, ул. Школьная–ул. Мира, У-3 | 0,1779 | Для строительства и обслуживания жилого дома | 18 996 589 | 1 899 660 | 2 500 000 |

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) со дня опубликования настоящего извещения и до 17.00 25 марта 2011 г. представляет в комиссию по организации проведению аукциона по адресу: аг. Путришки, ул. Тарханова, 49 документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;

копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Управления ГК по Гродненской области МФ РБ р/с № 3600514110160 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500027373, с отметкой банка о его исполнении;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: (8 029) 84 11 826, (8 0152) 917 424, (8 0152) 917 421.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона на расчетный счет Управления ГК по Гродненской области МФ РБ р/с № 3600514110160 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500027373, а также возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения (сумма, указанная в графе 7, подлежит корректировке исходя из фактических затрат) – на расчетный счет Управления ГК по Гродненской области МФ РБ р/с № 3600514110160 в филиал № 400 «АСБ «Беларусбанк» г. Гродно, код 752, назначение платежа 04901, УНН 500027373. Победитель аукциона в двухмесячный срок после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка обязан осуществить государственную регистрацию прав на земельный участок.

---

**Вяртаючыся да надрукаванага**

## Галоўнае, каб усё было добра з дзецьмі. А дарослыя павінны самі разбірацца паміж сабой

**У нумары «Звязды» за 19 студзеня пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Абодва мужчыны не пазбаўлены бацькоўскіх правоў і з'яўляюцца законнымі прадстаўнікамі сваіх дзяцей». Коратка нагадаем, што ён стаў следствам звароту ў рэдакцыю заяўнікаў са Слуцкага раёна, якія прасілі вярнуць у сям'ю малалетніх дзяцей. У канцы мінулага года памерла пляменніца жанчыны, якая, уласна кажучы, і прасіла дапамогі. У нябожчыцы засталіся дзяўчынка васьмі гадоў і хлопчык — чатырох. Дзеці ад розных мужоў. І вось неўзабаве пасля пахавання з удзелам міліцыі дзяцей пазабіралі родныя бацькі. Хлопчык патрапіў у Салігорск, дзяўчынка засталася ў Слуцку. Заяўніца і яе сястра, якая таксама потым патэлефанавала ў рэдакцыю, катэгарычна былі нязгодныя з гэтым. У прыватнасці, яны абвінавачвалі біялагічных бацькоў у п'янстве, у няздольнасці годна выхоўваць дзяцей, стварыць ім прыстойныя ўмовы для пражывання.**

Кіруючыся толькі памкненнем пераканаца (гэта мы і тады падкрэслівалі, і зараз нагадваем пра тое), што здароўю і жыццю дзетак — а аповеды абедзвюх жанчын і мужа адной з іх, з кім таксама давялося гутарыць, былі даволі эмацыянальнымі — нічога не пагражае, рэдакцыя аператыўна звязалася са спецыялістамі сектара аховы дзяцінства аддзела адукацыі Слуцкага райвыканкама. Праз некалькі дзён нам паведамілі, што з дзецьмі — і з дзяўчынкай у Слуцку, і з хлопчыкам у Салігорску — сапраўды ўсё ў парадку. На момант абследавання цяперашніх сем'яў іх біялагічных бацькоў абодва мужчыны былі цвярозыя, а для дзетак стварылі неабходныя ўмовы (натуральна, зыходзячы з матэрыяльнага дабрабыту кожнага з бацькоў). І ўвогуле пра іх, біялагічных бацькоў, адгукаліся не так дрэнна, як пра тое імкнуліся давесці нам заяўнікі. Галоўнае ж мы вынеслі ў загаловак той публікацыі: абодва мужчыны не пазбаўлены бацькоўскіх правоў і з'яўляюцца законнымі прадстаўнікамі сваіх дзяцей. Падавалася б, у гісторыі можна было паставіць кропку. Аднак яна мела працяг...

На працягу некалькіх дзён пасля выхаду адказу нам патэлефанавала яшчэ некалькі дарослых, якія маюць дачыненне — з розных бакоў — да гэтай сям'і. Агулам, такім чынам, размаўляць даводзілася з пяццю людзьмі (прабачце, так і засталося не зразумелым — ці тое проста сваякамі, ці ўжо колішнімі сваякамі). Хоць імёны і не называліся, натуральна, многія пазналі сябе і, як яно часта бывае, нават прачыталі «паміж радкоў» тое, чаго насамрэч і не было. У прыватнасці, адзін з суразмоўцаў сказаў, што матэрыял іх абразіў, што на самай справе ніхто алкаголем не злоўжывае. Таму мусім паўтарыць яшчэ раз: аповед першых заяўнікоў быў вельмі эмацыянальным, прычым з ухілам якраз на гэтую «асаблівасць». І ў афіцыйным адказе было дакладна сказана, што гэтыя словы не пацвердзіліся. А мы, зноў жа паўторымся, кіраваліся памкненнем пераканацца, што найперш з дзецьмі ўсё добра. Менавіта з дзецьмі. Дарослыя павінны разабрацца паміж сабой самі. Прабачце, але ўсе пяць суразмоўцаў у рэшце рэшт пачыналі збівацца — у большай ці меншай ступені — на абвінавачванні ў адрас іншых. Адзін прадстаўнік нават папрасіў напісаць пра ўзаемаадносіны ў гэтай вялікай радні асобна. А навошта? Па-першае, чаму гэта абавязкова патрэбна выносіць на старонкі рэспубліканскай газеты? Прыгожага тут мала. І ў рэшце рэшт, што людзям дасць сам факт абнародавання гэтай сітуацыі ў падрабязнасцях? Па-другое, што б ні напісаў журналіст, ёсць вялікая доля верагоднасці, што адзін з бакоў канфлікту ўсё роўна застанецца незадаволеным. Аднак, паколькі ігнараваць увогуле гэтыя звароты мы не маглі, мусілі яшчэ раз запрасіць адказ са Слуцкага райвыканкама. Як і ў першы раз — адносна лёсу дзяцей. Праўда, мы чакалі інфармацыі адносна і хлопчыка, і дзяўчынкі (прынамсі, у студзені яны, нягледзячы на пераезд хлопчыка да свайго біялагічнага бацькі ў Салігорск, абодва былі яшчэ зарэгістраваны ў сацыяльнай трохпакаёвай кватэры ў Слуцку, дзе пражывалі разам з маці да яе смерці), аднак афіцыйны ліст з аддзела адукацыі датычыўся толькі дзяўчынкі. Зноў жа — ніякіх імён і прозвішчаў.

«Па апублікаваным у газеце «Звязда» матэрыяле дадаём, што дзіця пражывае зараз у Слуцку ў сям'і біялагічнага бацькі, які ажыццяўляе дастатковы догляд за непаўналетняй.

У сектары аховы дзяцінства аддзела адукацыі Слуцкага райвыканкама ёсць заява ад бацькі аб прызначэнні часовай апекі над яго непаўналетняй дачкой дзядулем — да паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча і жыллёвых умоў. (Дарэчы, дзядуля пра тое нам паведаміў сам, яшчэ да атрымання адказу з райвыканкама — **С.Р.**).

Дзядуля дзяўчынкі — прыстойны чалавек, на ўліку ва ўрача нарколага і псіхіятра не стаіць, вельмі прывязаны да ўнучкі. Слуцкім раённым выканаўчым камітэтам будзе ў бліжэйшы час прызначаны часовым апекуном над непаўналетняй».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

РАДАР
ВЫПУСК № 2 (18)
Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь






**„У НАШЫ СЛУЖБОВЫЯ АБАВЯЗКІ ЎВАХОДЗІЦЬ І КАНТРОЛЬ РАБОТЫ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ ДАІ, АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ Ў ЗАБЕСПЯЧЭННІ БЯСПЕКІ ДАРОЖНАГА РУХУ РЭГІЁНАМ, НАГЛЯД ЗА ЗАХАВАННЕМ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ"**

**„ХОЧАЦЦА, КАБ ПЕШАХОДЫ ЗРАЗУМЕЛІ НАРЭШЦЕ, ШТО СПЫНІЦЬ АЎТАМАБІЛЬ ІМГНЕННА НЕЛЬГА, І ПЕРАСТАЛІ ЗНЯНАЦКУ ВЫБЯГАЦЬ НА ПРАЕЗНУЮ ЧАСТКУ. КІРОЎЦЫ Ж У СВАЮ ЧАРГУ ПАВІННЫ З ПАВАГАЙ СТАВІЦЦА ДА ПЕШАХОДАЎ"**

## Прэс-канферэнцыя

**Начальнік УДАІ Мінскай вобласці Мікалай Караткевіч падчас прэс-канферэнцыі паводле вынікаў года адказваў на пытанні журналістаў. Найбольш цікавыя і надзённыя пытанні прапануем вашай увазе.**

***1. Якая вобласць Беларусі найбольш аварыйная?***

Мінская вобласць, улічваючы сваю плошчу застаецца самай аварыйнай у Беларусі, на яе прыходзіцца больш за 20 працэнтаў ДТЗ. Сёння можна казаць, што колькасць загінулых у ДТЗ у 2010-м — такая ж, як і ў 2009 — 352 чалавекі. Скарацілася і колькасць здарэнняў, звязаных з кіроўцамі ў нецвярозым стане. А вось з пешаходамі — не ўсё так проста. 30 працэнтаў людзей, якія сталі ахвярамі ДТЗ, знаходзіліся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення.

***2. Едзеш? Прышпіліся! Выпіў? Не едзь.***

Выкарыстанне рамянёў бяспекі прыносіць свае карысць. Па Мінскай вобласці адзначаецца зніжэнне колькасці загінулых — усё больш кіроўцаў прышпільваюцца. Яшчэ адна праблема — кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення. У рэспубліцы затрымана больш за 50 тысяч кіроўцаў па гэтай прычыне, і больш за 10 тысяч — па Мінскай вобласці. Тысяча — паўтора.

***3. Што рабіць, калі кіроўца маршрутнага таксі падчас руху размаўляе па тэлефоне?***

Званіць у міліцыю. Калі на тэлефон дзяжурнай часткі паступіць паведамленне пра тое, што вадзіцель маршрутнага таксі на працягу пэўнага часу едзе і размаўляе па мабільным тэлефоне, яго можна прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці. Гэта магчыма ў выпадку, калі будуць сведкі парушэння і калі інфармацыя пра тое, што тэлефон абанента ў пэўны момант быў актыўны, пацвердзіцца. Усе правапарушэнні па такіх пытаннях ўносяцца ў базу звестак.

Артур АЛЕКСАНДРОВІЧ, камандзір спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла», падпалкоўнік міліцыі:

# «НАШ ЧАЛАВЕК, КАЛІ ТАГО БУДЗЕ ПАТРАБАВАЦЬ СІТУАЦЫЯ, МОЖА НЕСЦІ СЛУЖБУ Ў ДАЛЁКАЙ ВЁСЦЫ, ДЗЕ ПРАЕЗНАЯ ЧАСТКА, БЫВАЕ, НАГАДВАЕ ЎХАБЫ І ПАГОРКІ»





**Назва «Страла» ў многіх вадзіцеляў асацыюецца выключна з падраздзяленнем ДАІ, супрацоўнікі якога толькі караюць парушальнікаў на дарозе. Хто-ніхто, праўда, скажа, што гэта міліцыянеры, асноўная задача якіх — суправаджэнне ў фармаце эскорту афіцыйных асоб, замежных гасцей, што прыязджаюць у Беларусь, а таксама першых асоб дзяржавы. Нехта будзе мець рацыю, калі будзе сцвярджаць, што бачыў міліцыянера з жазлом на матацыкле БМВ у нейкай закінутай вёсцы на ўскраіне рэспублікі.**

**Кім жа на самай справе з'яўляюцца супрацоўнікі гэта спецпадраздзялення і якія задачы на іх ўскладзены? Пра гэта і шмат што іншае журналіст «Звязды» вядзе размову з камандзірам спецыяльнага падраздзялення дарожна-патрульнай службы ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь Артурам АЛЕКСАНДРОВІЧАМ.**

**— Артур Аляксеевіч, калі ў народзе кажуць пра «жалезных салдат» у сістэме дзяржаўтаінспекцыі, то гэта пра супрацоўнікаў «Стралы»?**

— Ведаеце, за час маёй трохгадовай службы камандзірам гэтага спецпадраздзялення даводзілася чуць шмат чаго. Маўляў, тут толькі чэрствыя і бяздушныя людзі, якія толькі строга выконваюць літару закона, і любыя абставіны, што здараюцца на дарозе з тым ці іншым вадзіцелем, ім ні па чым. Адразу хочацца сказаць усім, хто так думае ці думаў пра нас: спецпадраздзяленне «Страла», якому гэтымі днямі спаўняецца 18 гадоў, — гэта звычайны службовы калектыў прафесіяналаў, якія надзелены не толькі пэўнымі законнымі паўнамоцтвамі, але ж і мае шырокае кола задач, у тым ліку і дзяржаўнай важнасці. Калі нехта не ведае, то скажу, што асноўная наша задача — гэта суправаджэнне высокіх службовых асоб дзяржавы і эскартаванне кіраўнікоў замежных дэлегацый, прадугледжаных дыпламатычным пратаколам.

**— Відавочна, што падчас ўтварэння «Стралы», якое супала з набыццём нашай краінай самастойнасці, функцыі спецпадраздзялення былі больш вузкімі, чым цяпер. Сёння ж ледзь не кожны вадзіцель можа штодня ўбачыць інспектара ДПС на транспарце са значком стралы на любым участку дарогі.**

— Не бачу ў гэтым нічога асаблівага, тым больш, што ў нашы службовыя абавязкі ўваходзіць і кантроль работы падраздзяленняў ДАІ, аказанне дапамогі ў забеспячэнні бяспекі дарожнага руху рэгіёнам, нагляд за захаваннем працоўнай дысцыпліны супрацоўнікам міліцыі.

**— У любым выпадку, прыезд «Стралы» ў нейкі раён краіны святам для супрацоўнікаў мясцовай ДАІ не назавеш?**

— Дазволю з вамі не пагадзіцца. Прыезд «Стралы» ў нейкі рэгіён — гэта рэальная дапамога на месцы. Святам наш візіт не назавеш для тых удзельнікаў дарожнага руху, хто парушае правілы, а таксама для міліцыянераў, якія не прытрымліваюцца патрабаванняў, што да іх прад'яўляюцца. Паверце, што ніводзін з супрацоўнікаў «Стралы», які мае для паўнацэннага нясення службы і адпаведнай праходнасці аўтамабілі ці матацыклы, апошнія мадэлі фота- і відэафіксатараў, не будзе арганізоўваць пагоню ці спыняць кагосьці без патрэбы. Мы ж, як і звычайныя супрацоўнікі дзяржаўтаінспекцыі, закліканы ў тым ліку і наводзіць парадак на дарозе. І гэта зусім не значыць, што супрацоўнік «Стралы» можа дзяжурыць на службовым аўтамабілі толькі на аўтабане. Не здзіўляйцеся, але наш чалавек, калі таго будзе патрабаваць сітуацыя, можа несці службу ў далёкай вёсцы, дзе праезная частка, бывае, нагадвае ўхабы і пагоркі. У такім выпадку на дапамогу прыходзіць сучасны матацыкл.

**— Артур Аляксеевіч, можна правесці рысы адрознення супрацоўнікаў спецпадраздзялення ДПС «Страла» і звычайных інспектараў дзяржаўтаінспекцыі?**

— Розніца, бадай, толькі ў функцыянальных магчымасцях. А што тычыцца наяўнасці дзелавых якасцяў, прафесійных навыкаў і звычайных чалавечых рысаў характару, то яны, думаю, не маюць нейкіх значных адрозненняў. Дарэчы, супрацоўнікі «Стралы» — гэта людзі, якія ў нядаўнім мінулым неслі службу ў звычайным падраздзяленні ДАІ. А, значыць, ведаюць усе яе нюансы, так бы мовіць, знутры.

**— Тым не менш, падбор кандыдатур у спецпадраздзяленне «Страла», мабыць, вельмі строгі?**

— З пазіцыі кіраўніка падраздзялення, якое гэтымі днямі адзначыць сваё паўналецце, скажу, што камплектаванне «Стралы» не заснавана на прынцыпах падбору «жалезных салдат». Тут, як і ў любым міліцэйскім калектыве, на першым плане ветлівасць, культура паводзін, арганізатарскія здольнасці. Галоўны ж крытэр адбору — абавязковы 5-гадовы службовы стаж у дзяржаўтаінспекцыі і служба ў міліцыі на працягу 10 гадоў. Да таго ж кандыдаты на службу ў спецпадраздзяленне «Страла» праходзяць псіхафізіялагічнае тэсціраванне і здачу неабходных нарматываў па фізічнай падрыхтоўцы.

**— Веданне замежнай мовы неабавязковае?**

— Пакуль што не. Думаю, што на сённяшнім этапе для супрацоўнікаў «Стралы» дастаткова прафесійна ўпраўляцца з новай тэхнікай, а гэта апошняя лінейка аўтамабіляў «Крайслер» і «Опель-Вектра», матацыклаў «Ямаха» і БМВ, умець аператыўна спыніць злосных парушальнікаў дарожнага руху і праяўляць свае лепшыя якасці падчас сустрэчы высокіх гасцей. Мяркую, што авалодаць нейкай замежнай мовай можна і самастойна.

**— Артур Аляксеевіч, напярэдадні святочнай даты, 18-годдзя з дня ўтварэння СП ДПС «Страла», што б вы пажадалі сваім падначаленым?**

— Напачатку яшчэ раз падкрэсліў бы, што спецпадраздзяленне «Страла» — гэта магутны, мабільны, добра аснашчаны і высокапрафесійны міліцэйскі калектыў, у якім асаблівая ўвага ўдзяляецца павышэнню кваліфікацыі і прафесійнаму майстэрству супрацоўнікаў. Зычу ўсім добрага настрою, моцнага здароўя і ўдачы ва ўсім!




## ПРАФЕСІЙНЫ ПАДЫХОД ДА ПРАФЕСІЙНЫХ АБАВЯЗКАЎ

У супрацоўніка спецпадраздзялення дарожна-патрульнай службы «Страла», маёра міліцыі Андрэя Ігнатовіча штодзень клопатаў пад завязку. Ён — намеснік начальніка службы прафілактыкі і прапаганды дарожнага руху. Выступленне ў працоўных калектывах з тлумачальнай мэтай аб выкананні Правілаў, удзел у рэспубліканскіх акцыях, конкурсы юных інспектараў дарожнага руху. Гэта далёка не поўны спіс службовых абавязкаў афіцэра. Праўда, пры неабходнасці супрацоўнік СП ДПС «Страла» ў самы кароткі тэрмін можа адправіцца на звычайнае дзяжурства па навядзенні парадку на шматлікіх дарогах рэспублікі. Значны службовы стаж і набыты жыццёвы вопыт дазваляюць маёру міліцыі Андрэю Ігнатовічу на высокім прафесійным узроўні выконваць любую справу, даверанаю кіраўніцтвам спецпадраздзялення.

## Журналісты — аўтамабілістам

**Прадстаўнікі айчынных СМІ ў чарговы раз пацвердзілі ісціну, што амаль кожны журналіст — вадзіцель ці знаток у аўтамабільнай справе. Пацвярджэннем таму можна лічыць выніковую прэс-канферэнцыю «Залатое пяро», якую правёў імпарцёр Volkswagen у Беларусі.**

Пра тое, як будзе развівацца аўтамабільны рынак Беларусі ў 2011 годзе, найбольш даступна і зразумела для беларускіх чытачоў напісалі: Алена Анкуда («БелГазета», намінацыя «Навіны»), Сяргей Янчанка (часопіс «Дело», намінацыя «Аналітыка»), Аляксандр Стэльмах (onliner.by, намінацыя «Спецпраект»), Ганна Трубачова (газета «Аўтабізнэс», намінацыя «Тэст-драйв»).

Сярод аўтамабільных выданняў Гран-пры атрымаў Павел Казлоўскі («Аўтабізнэс»), а сярод дзелавых выданняў такі ж прыз дастаўся Віктару Радзькову, які прадстаўляе часопіс «Большой».

# ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ

**Начальнік УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл НЕЎМЯРЖЫЦКІ на сваёй прэс-канферэнцыі выказаў занепакоенасць загружанасцю транспартам Магілёва, праблемай для жыхароў горада сталі паркоўка і заторы.**



Цяпер у абласным цэнтры зарэгістравана каля 90 тысяч легкавых аўтамабіляў. Штогод прырост складае каля 5 тысяч аўтамабіляў: за апошнія 4 гады, паводле статыстыкі, стала на 25 тысяч аўтамабіляў болей.

— З усіх паведамленняў, якія паступаюць ад грамадзян на дзяжурную частку ДАІ, 45% датычацца няправільнай паркоўкі аўтамабіляў, — адзначыў Міхаіл Неўмяржыцкі. — Людзі скардзяцца, што аўтаўладальнікі кідаюць свае машыны на праездах і зялёных газонах. Таму нядаўна разам са старшынёй Магілёўскага гарвыканкама Станіславам Барадаўкам абмеркавалі шэраг мераў па паляпшэнні сітуацыі.

Пры рэканструкцыі дваравых тэрыторый будуць пашырацца мясцовыя праезды, на вуліцах Магілёва з'явяцца дадатковыя паркавачныя месцы з частковым заездам на тратуар. Маюць намер інспектары ДАІ выкарыстоўваць і адміністрацыйны рэсурс: сёння, калі штрафы, асабліва за паўторнае парушэнне, сталі значнымі, спагнанні становяцца адчувальным сродкам ціску на дысцыплінаванасць вадзіцеляў.

Акрамя гэтага, гарадскія ўлады набываюць сучасны эвакуатар з поўнай пагрузкай аўтамабіля. Гэта дарагая тэхніка — яе кошт перавышае 250 мільёнаў рублёў. Аднак такі эвакуатар дазволіць разгрузіць вуліцы горада ад няправільна прыпаркаваных аўтамабіляў, якія ствараюць праблемы для дарожнага руху.

Журналісты таксама ўзнялі на прэс-канферэнцыі праблему дрэнных дарог. Вуліцы нават у цэнтры Магілёва не з'яўляюцца бездакорнымі. А яміны на мікрараёнах ужо трэба вывучаць па спецыяльнай карце. Таму аўтаўладальнікі напружана чакаюць вясны і рамонту дарог.

Дарожныя праблемы, зразумела, тлумачацца вялікімі матэрыяльнымі выдаткамі на капітальны рамонт. ДАІ бачыць тут сваю ролю ў тым, каб працаваць з кіраўнікамі арганізацый, якія адказваюць за дарогі. Толькі за адзін месяц да адміністрацыйнай адказнасці за нездавальняючы стан дарог прыцягнута 70 афіцыйных асоб.

Міхаіл Неўмяржыцкі таксама закрануў і іншыя праблемныя пытанні, якія хвалююць ДАІ і аўтаўладальнікаў. Напрыклад, ажыятаж з атрыманнем вадзіцельскіх пасведчанняў новага ўзору. Кіраўнік Магілёўскай ДАІ папрасіў жыхароў Магілёўскай вобласці не спяшацца на абмен і не ствараць штучныя заторы з выдачай новых пасведчанняў:

— Я хачу звярнуць увагу, што абавязковы абмен вадзіцельскага пасведчання не патрабуецца. Пасведчанні, якія былі выданы раней, будуць пацвярджаць права ўладальніка на кіраванне транспартнымі сродкамі ўвесь час іх дзеяння. Яны абменьваюцца па жаданні, але, пакуль сістэма яшчэ не зусім наладжана, варта крыху пачакаць і зрабіць абмен у больш спакойнай абстаноўцы, крыху пазней.

## Пытальнік

***1. Ці сапраўдная даверанасць на аўтамабіль, напісаная ў Маскве жыхаром г. Мінска, для наступнага зняцця аўтамабіля з уліку па месцы пражывання гаспадара даверанай асобай?***

**Яўген Шчацінін,** *г. Мінск*

Аўтамабіль магчыма зняць з уліку па месцы пражывання яго гаспадара пры ўмове, калі даверанасць натарыяльна завераная.

❑

***2. Пасля 3-х тыдняў адсутнасці ў г. Мінску ўладальнік аўтамабіля па вяртанні дамоў высветліў, што на яго аўтамабілі, што знаходзіўся гэты час на паркоўцы ў двары, адсутнічае адзін дзяржаўны рэгістрацыйны знак. Аўтамабіль жа неабходна зняць з уліку ў ДАІ. Пры гэтым гаспадар аўто падчас гэтай працэдуры прысутнічаць не мае магчымасці — яе плануе правесці чалавек па даверанасці. Ці можна ў такім выпадку зняць аўтамабіль з уліку пры наяўнасці аднаго нумарнога знака?***

**Іван Кулік,** *Брэсцкая вобласць*

Калі рэгістрацыйны знак быў згублены, то пры зняцці з уліку (замене рэгістрацыйнага знака) здаецца 1 рэгістрацыйны знак і ў заяве па факце страты другога рэгістрацыйнага знака пішацца тлумачэнне для наступнага інфармавання ў РАУС.

Калі ёсць упэўненасць у тым, што рэгістрацыйны знак быў скрадзены, неабходна звярнуцца ў аддзел міліцыі па месцы жыхарства. Пасля атрымання пастановы аб адмове ці завядзенні крымінальнай справы трэба звярнуцца ў МРЭА ДАІ для наступнай замены рэгістрацыйнага знака альбо зняцця з уліку.

# У ДАІ — НАВАСЕЛЛЕ

**На днях аддзяленне Дзяржаўтаінспекцыі Смалявіцкага РАУС адзначыла наваселле**

**Пераезду ў новае памяшканне даішнікі чакалі з нецярпеннем. Таму падзею адзначылі, як таго патрабуюць традыцыі: перарэзалі чырвоную стужку і сваімі сіламі наладзілі невялікі канцэрт. Засталося толькі кошку першай пусціць праз парог. Да гэтага справа не дайшла. Замест кошкі супрацоўнікам падаравалі цацачнае медзведзяня, апранутае ў форму інспектара ДПС, — новы імправізаваны лагатып ДАІ і талісман, які, паводле сцвярджэння супрацоўнікаў, прынясе ўдачу.**

Раней аддзелу Дзяржаўтаінспекцыі даводзілася туліцца ў адным памяшканні разам з міліцыяй і інспекцыяй па справах непаўналетніх. Пра асобныя кабінеты для супрацоўнікаў увогуле размова не вялася. Такая «эканомія» плошчы таксама стварала лішнія клопаты і для наведнікаў. Таўкатня на калідорах, горы папер у кабінетах — адным словам, умовы працы пакідалі жадаць лепшага. На сёння ДАІ Смалявіцкага РАУС размяшчаецца ў будынку раённага аддзела Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны РБ. Прасторныя кабінеты з новай мэбляй і камп'ютарнай тэхнікай, актавая зала, вучэбны клас — умовы працы, пра якія раней супрацоўнікі ДАІ толькі марылі.

— Дзякуй за дапамогу ўсім, хто паспрыяў, каб нашы супрацоўнікі перабраліся ў новае памяшканне. Спадзяюся, што добрыя бытавыя ўмовы станоўча адаб'юцца на выніках працы, — выказаў спадзяванне начальнік міліцыі грамадскай бяспекі АУС Мінаблвыканкама, палкоўнік міліцыі Мікалай Мельчанка.

Часовы выканаўца абавязкаў начальніка аддзела ДАІ Смалявіцкага РАУС, маёр міліцыі Аляксандр Чарэй запэўніў усіх прысутных, што супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі цяпер будуць працаваць яшчэ больш натхнёна.



# На экзамен — у Жыткавічы

**Кіроўцам самых аддаленых раёнаў Гомельшчыны цяпер не трэба далёка ездзіць, каб зарэгістраваць свой аўтамабіль або здаць экзамен. У Жыткавічах адкрыўся новы міжраённы рэгістрацыйна-экзаменацыйны аддзел ДАІ.**

— Мы пазбавіліся ад яшчэ аднаго даўгабуда, — шчыра прызнаецца старшыня Жыткавіцкага райвыканкама Мікалай Какора. — Кожны год у нашым раёне даўгабуды пертвараюцца ў будынкі для людзей. Зусім нядаўна мы адкрылі новы гатэль, які будаваўся амаль 25 гадоў. І вось цяпер гэтае збудаванне, работы над якім пачаліся ў 2007 годзе.

Асаблівасці цяжкасцяў пры будоўлі хутка забытыя, а вось карысць для жыхароў не толькі Жыткавіч — відавочная. Першыя наведвальнікі змаглі аформіць дакументы адразу ж, у дзень адкрыцця. Сюды плануюць прыязджаць кіроўцы не толькі з Жыткавіцкага раёна, але і з Петрыкаўскага і Лельчыцкага. Гэта ж куды бліжэй і зручней, чым цягнуцца ў Мазыр, як раней.

Сацыяльна значны аб'ект уключае ў сябе асноўны і адміністрацыйны корпус, абгароджаную пляцоўку для агляду транспартных сродкаў, дзве назіральныя ямы пад навесам. Жыхары Палесся змогуць атрымаць увесь спектр неабходных паслуг — зарэгістраваць транспарт, атрымаць пасведчанне кіроўцы і іншае. Дарэчы, у трох раёнах, якія абслугоўвае новы аддзел, зараз на ўліку амаль 37 тысяч транспартных сродкаў, якія належаць індывідуальным уладальнікам і юрыдычным асобам. На тэрыторыі Гомельшчыны іх зараз больш за 465 тысяч. І колькасць машын расце пастаянна. Толькі летась прырост транспарту ў параўнанні з папярэднім годам склаў амаль 4%. Больш чым на 6% у вобласці выдадзена пасведчанняў кіроўцы. Значны рост аўтамабіляў і тых, хто хоча імі кіраваць, адбыўся не толькі ў вялікіх гарадах, але і ў вёсках. Таму адкрыццё сучаснага МРЭА ў Жыткавічах — значная падзея не толькі для саміх супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, а і для ўсіх грамадзян.

— У супрацоўнікаў рэгістрацыйна-экзаменацыйных падраздзяленняў пабольшала работы, — адзначае начальнік упраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар Макушэнка. — Адкрыццё новага будынка мае вялікую ролю. Ён вырашае праблему скарачэння часу абслугоўвання грамадзян, якія хочуць зарэгістраваць транспартныя сродкі, зняць іх з уліку, а таксама атрымаць пасведчанні кіроўцы новага ўзору.



Начальнік МРЭА Жыткавіцкага РАУС Вячаслаў Раманаў атрымаў сімвалічны ключ ад новага будынка.

Што датычыць пасведчанняў новага ўзору, Вячаслаў Раманаў, начальнік новага МРЭА Жыткавіцкага раённага аддзела ўнутраных спраў, запэўнівае, што праблем у кіроўцаў аўто быць не павінна:

— Думаю, што чэргаў не будзе. Праца калектыву адладжаная, арганізуем усё, як трэба.

У самы бліжэйшы час пачне працаваць і клас, дзе будучыя кіроўцы будуць трымаць справаздачу перад строгімі экзаменатарамі з ДАІ на веданне правілаў дарожнага руху. Сучаснае камп'ютарнае абсталяванне ад упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама ўстаноўлена і праходзіць апошнюю наладку. Палешукам цяпер не прыйдзецца лётаць за 120 кіламетраў у Мазыр, каб здаць ці пераздаць экзамен.

**З моманту выдачы аўтамабільных правоў новага ўзору іх уладальнікамі сталі ўжо звыш 60 тыс. чалавек.**

Жаночы погляд

Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Беларусі:

# «Я была першай афіцэрам-дзяўчынай у «Страле»

**Міліцэйскую кар'еру наша сённяшняя госця пачынала дзевяць гадоў таму. І не дзе-небудзь, а ў «Страле» — самым прэстыжным спецпадраздзяленні ДПС МУС Беларусі.**



— «Глядзі, «страла» пайшла», — падобнае чую пра сябе штораз, калі прыязджаю да маці ў вёску. У «Страле» ўжо больш як пяць гадоў не працую, а мянушка так і засталася.

**— Ганна, як вы трапілі ў «Стралу»? Пэўна, міліцэйскай формай трызнілі з дзяцінства?**

— Зусім не. Калі б мне тады сказалі, што буду працаваць у міліцыі, а тым больш у «Страле», не паверыла б. Бо трапіць у спецпадраздзяленне не так ужо і проста — праводзіцца строгі адбор. У свой час я скончыла факультэт журналістыкі БДУ па спецыяльнасці інфармацыя і камунікацыя. Недзе з год прапрацавала ў прэс-службе Міністэрства эканомікі. У «Стралу» трапіла, можна сказаць, выпадкова. Мне, па вялікім рахунку, пашанцавала. Там якраз увялі новую пасаду і шукалі спецыяліста па сувязях з грамадскасцю. Як пасля высветлілася, мяне парэкамендавалі на журфаку. Працаваць у «Страле» на той час, у прынцыпе, як і цяпер, было ганарова. Нават мясцовы ўчастковы, каб павітацца з маім татам, дарогу перабягаў (*усміхаецца*). У форме ж я ніколі сябе не ўяўляла, але калі ўпершыню апранула, спадабалася. Насіла яе з гонарам нават тады, калі была магчымасць хадзіць у цывільным.

**— Не шкадуеце, што так склаўся лёс?**

— Што вы, зусім не. Я адчуваю сябе на сваім месцы. Праўда, на пачатку было складана: праходзіла пачатковую падрыхтоўку, нават кнігі па начах чытала, каб разабрацца ў спецыфіцы службы. У выніку, у тым ліку і дзякуючы калегам, якія цярпліва мне ўсё тлумачылі, я хутка асвоілася і ўжо сама магла кампетэнтна адказваць на пытанні журналістаў. І з мужам мы, дарэчы, пазнаёміліся на працы. Прычым спачатку, як гэта бывае, адно аднаго нават не заўважалі.

**— Падзяліцеся самымі яркімі ўражаннямі ад першых дзён службы.**

— Пачала службу ў маі 2002 года — і адразу ж трапіла на эскорт. Эскартавалі экс-прэзідэнта Арменіі Роберта Качарана. Я сядзела ў замыкальным аўтамабілі з фотаапаратам і назірала за відовішчнай і зладжанай работай калег з разяўленым ротам. Толькі падумаць, адлегласць паміж коламі матацыклаў была менш за метр... У эскорце кожны адказвае за свой накірунак работы, але пры гэтым усё выглядае, як адзінае цэлае. Адным словам, уражанняў хапіла надоўга. Запомніліся і першыя стрэльбы. Я тады з пісталета трапіла па мішэні два разы з трох. З аўтамата страляць было страшна: таму, націскаючы на курок, я па інерцыі заплюшчвала вочы (*усміхаецца*). Першы раз, калі мне прапанавалі ісці на павышэнне, я адмовілася: так мне не хацелася сыходзіць са «Стралы». У 2006 годзе ўсё ж такі згадзілася, бо разумела, што трэці раз прапаноўваць не будуць, і перайшла ва ўпраўленне ДАІ МУС.

**— А цяпер пра дарогу. Ганна, вам самой падабаецца кіраваць, альбо вы больш камфортна адчуваеце сябе ў ролі пасажыра?**

— З мужам езджу без боязі. А вось са «стралкоўцамі», якія праходзілі школу экстрэмальнага кіравання, ездзіць пабойваюся. Калі трэба выязджаць на заданне, звычайна саджуся на задняе сядзенне. У мяне іншы стыль кіравання. Я езджу павольна, спакойна, загадзя зніжаю хуткасць.

**— Прафесійная дзейнасць, пэўна, адбіваецца і на выхаванні дачкі?**

— А як жа. Яна ў мяне з двух гадоў ведае, што машыны павінны стаяць, калі гарыць чырвонае святло. Не праміне тату зрабіць падказку: «Ты чаму не едзеш? Зялёнае ўжо загарэлася». Абураецца, калі бачыць няправільна прыпаркаваную машыну: «Сталі тут, не даюць людзям праехаць».

**— А як яна ставіцца да дзіцячага аўтакрэсла?**

— Сапраўды, многія мамы скардзяцца, што іх дзеці адмаўляюцца садзіцца ў аўтакрэсла. Я ж пераканалася на ўласным вопыце, што калі з першых дзён перавозіць дзіця ў крэсле, то ніякіх пытанняў не ўзнікне. Часам, здараецца, што я забудуся прышпіліць малую. Дык што б вы думалі, яна абавязкова мне пра гэта нагадае. Нізавошта непрышпіленай не паедзе.

**— Ганна, вы, як мне падалося, дастаткова ўражлівая?**

— Не без гэтага. Я штодзень адсочваю ўсе дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам дзяцей. Кожнае здарэнне, як бы мне не хацелася абстрагавацца, прапускаю праз сябе. Нядаўна маці везла дзіця на санчачках па пешаходным пераходзе. Сама прайшла, а малога зачапіла машынай... Чытаю зводку і тут жа, як маці, уяўляю жудасную карцінку. Адразу ж тэлефаную сваім знаёмым маладым матулям і прашу, каб яны не вазілі дзяцей на санках праз дарогу, а бралі на рукі. Мае сяброўкі, у адрозненні ад мяне, у гэтым плане непрадбачлівыя. Летам ездзілі з адной з іх на возера. Разам з намі былі маленькія дзеці. Калі ўбачыла, што сяброўка імчыць наперадзе па гравійцы з хуткасцю 90 км/г, у мяне валасы дуба ўсталі. Я ёй пасля гэтага прачытала такую лекцыю па бяспецы! Дарэчы, кожная мая сустрэча з сябрамі заканчваецца лікбезам па ПДР. Я не праміну расказаць якую-небудзь «страшылку», каб хоць трохі іх абразуміць. А павышанае адчуванне небяспекі ў мяне было яшчэ да таго, як я прыйшла ў ДАІ. У студэнцкія гады мы вельмі хутка ехалі з сябрамі. «Сяргей, — звярнулася я да сябра, які быў за рулём, — ты хочаш жыць? Збаў хуткасць». Ён прыслухаўся і, што вы думаеце, калі мы павярнулі, то ўбачылі ўпоперак дарогі гужавую павозку, на якой спаў мужык. Калі б я прамаўчала, невядома, чым бы скончылася наша паездка...

**— Як часта даводзіцца выязджаць на ДТЗ з пацярпелымі?**

— Як зараз памятаю, паступіла ўказанне здымаць усе дарожныя, і я разам са следча-аператыўнай групай выехала на першае ў сваім жыцці ДТЗ. Сказаць, што мне было вельмі страшна, значыць нічога не сказаць. Трупы, пах крыві... А пасля прыязджаюць сваякі пацярпелых... Адна справа, калі чытаеш зводку, і зусім іншая, калі бачыш трагедыю сваімі вачыма.

**— Якія планы па прафілактыцы ДТЗ у ДАІ рэспублікі на гэты год?**

— Перад Новым годам, вы ж ведаеце, пачалася новая праграма па павышэнні бяспекі на дарогах «Узаемапаразуменне». Асноўная мэта засталася нязменнай з 2007 года — захаваць жыццё. Толькі сёлета вырашылі зрабіць акцэнт на ўзаемапаразуменні. Ёсць асобна ўжо разуменне паміж пешаходамі, асобна — паміж кіроўцамі. Але вось узаемнага разумення практычна няма. Хочацца, каб пешаходы зразумелі нарэшце, што спыніць аўтамабіль імгненна нельга, і перасталі знянацку выбягаць на праезную частку. Кіроўцы ж у сваю чаргу павінны з павагай ставіцца да пешаходаў, імкнуцца быць на тры крокі наперадзе, загадзя зніжаючы хуткасць ля навучальных устаноў, прыпынкаў грамадскага транспарту, рэгуляваных і нерэгуляваных пераходаў. Мы б хацелі, каб сярод удзельнікаў дарожнага руху была нецярпімасць да агрэсіўных паводзін на дарозе, каб людзі больш давяралі супрацоўнікам ДАІ, часцей ішлі на дыялог, аказвалі дапамогу. Уся праграма разбіта на 8 блокаў. Мы не стаім на месцы і пастаянна шукаем нестандартныя рашэнні, каб прыцягнуць увагу людзей. У прыватнасці, нядаўна распрацавалі азбуку бяспекі дарожнага руху. Дзякуючы ёй дзеці паралельна з літарамі могуць у гульнявой форме асвойваць розныя дарожныя сітуацыі. Міністэрства адукацыі літаральна на днях рэкамендавала ўсім школам набыць гэтую азбуку. Што тычыцца флікераў, то мы плануем сёлета дастукацца да свядомасці кожнага беларуса. Пры гэтым будзем старацца пазбягаць адміністрацыйнага метаду. У гэтым плане добра зарэкамендавала сябе супрацоўніцтва са светарамі. Калі, напрыклад, ксёндз прачытаў вернікам лекцыю ды раздаў па флікеры, то ўжо наступны раз усе бабкі ідуць у касцёл са святлоадбівальнымі павязкамі.

**— На апошні зімовы месяц выпадае не толькі Дзень абаронцаў, але і дзень стварэння «Стралы». Будзем жадаць што-небудзь калегам?**

— Хацелася б пажадаць здароўя і вытрымкі, бо праца ў нашых мужчын вельмі нервовая, адказная. Каб яны не страцілі свайго пачуцця гумару і аптымізму, бо жарт нават у самай напружанай сітуацыі можа зняць стрэс. Безумоўна, павышэння па службе, каб заўважалі і адзначалі іх працу. Узаемапаразумення ў сем'ях. І вядома ж, зычу пабольш цярпення іх жонкам, бо праца ў калег такая, што яны нячаста бываюць дома.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Надзея ДРЫЛА, Ілья ЛАПАТО, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Ілона ІВАНОВА, Вольга КОРШУН.

